***Дз.У. Дубінін,*** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры методыкі выкладання гісторыі і дапаможных дысцыплін;*
***Дз.М. Дубініна,*** *кандыдат педагагічных навук, выкладчык кафедры методыкі дашкольнага выхавання (Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка)*

# Этнапедагагічная спадчына ў экалагічным выхаванні дашкольнікаў

Слова *экалогія* ў перакладзе з грэчаскага азначае "навука пра дом". У кожнай жывой істоты свой дом. А для ўсіх разам — гэта наша планета Зямля. Ёсць на ёй прыгожы куток, што мілы сэрцу кожнага беларуса — Беларусь. Спрадвеку беларусы клапаціліся пра свой родны дом. Пра гэта сведчаць тыя скарбы народнай мудрасці, што захаваліся да сённяшняга часу.

У аснову этнапедагагічнай спадчыны беларусаў пакладзены светапогляд, звычаі, традыцыі, абрады і вераванні нашых продкаў. У ёй яскрава адлюстраваны ўяўленні аб навакольным асяроддзі. Нашы продкі спакон вякоў пакланяліся сілам прыроды, у той жа час яны адчувалі сябе яе неад'емнай часткай.

У любві да прыроднага асяроддзя і пазітыўнага стаўлення да яго беларусы выхоўвалі сваіх дзяцей. Таямніцы прыроды, яе адвечны кругаварот маленькае дзіця спасцігала з дапамогай вуснага паэтычнага слова. Слоўная творчасць дапамагала дарослым вучыць малых бачыць змены, якія адбываліся ў прыродзе, звязваць іх з бытаваннем і жыццём чалавека. Прынцып прыродаадпаведнасці быў асноватворным у выхаванні дзіцяці. Гэта яскрава пацвярджаецца сродкамі ўвасаблення гэтага прынцыпу ў жыццё.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Каляндарна-абрадавая паэзія ў маляўнічых вобразах адлюстроўвала лад народнага жыцця, яго сувязь з прыродным светам. Абрады беларусаў захаваліся да нашых дзён. Асноватворныя рысы гэтых абрадаў у пэўнай ступені ўплываюць на экалагічнае выхаванне дзіцяці. Тут можна вызначыць культ сонца (пакланенне сонцу; ваджэнне карагодаў па крузе, за сонцам; раскладванне вогнішча), культ вады (шанаванне рэчак, крыніц, азёр; ачышчальная, лекавая, апладатваральная сіла вады; рытуальнае мыццё і абліванне вадой), культ прыроды (перакліканне свету чалавека са светам прыроды), культ раслліннасці (травы, кветкі; выкарыстанне лекавых траў).

Ад пакалення да пакалення перадавалі нашы продкі звесткі пра свет раслін і жывёл. Народная памяць да сённяшняга часу захоўвае веды пра лекавыя расліны, уменне карыстацца імі. Добра было б, каб пра ўласцівасці гэтых раслін даведаліся нашы дзеці. Асабліва неабходна звярнуць іх увагу на тыя, з якімі яны найбольш часта сустракаюцца ў час экскурсій, паходаў, прагулак. Гэта мята, крапіва, палын, бяроза, брусніцы, журавіны, суніцы, чарніцы, маліна і інш. Пажадана расказаць дзецям не толькі пра тое, якія расліны і пры якіх хваробах трэба браць, але і як іх ужываць.

Неабходна даць дзецям пэўныя веды пра іншыя сакрэты лесу. Менавіта ў дашкольным узросце мэтазгодна зрабіць з імі першыя крокі ў грыбную азбуку, расказаць, калі трэба пачынаць збіраць грыбы, як адрозніваць ядомы грыб ад неядомага. Экскурсіі на луг і ў лес, невялікія гутаркі дапамогуць данесці да ведама дзіцяці пэўныя народныя веды пра царства прыроды.

Назіраць за тымі зменамі, якія адбываюцца ў царстве раслін і жывёл, дарослыя прывучвалі малых з дапамогай ***народных прыкмет***, каб даць магчымасць дзіцяці ўважліва прасачыць узаемасувязь паміж паводзінамі жывёл, птушак і станам надвор'я.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У мэтах выхавання і навучання гэтыя скарбы народна мудрасці выкарыстоўваюцца намі і сёння. У час **назіран няў за з'явамі прыроды** народныя прыкметы з'яўляюц для дзяцей тым падручнікам, які лёгка і хутка вучыць і арыентавацца і прыродным асяроддзі, дапамагае здзяйсняц кароткатэрміновыя і доўгатэрміновыя вопыты з прадмета мі і з'явамі чароўнага свету прыроды. Дзіцячаму разумен ню не цяжка ўявіць, што:

*Пакуль гром не загрыміць, зямля не адтае.*

*Маладзік рогі задраў — на пагоду.*

*Куры цярэбяцца і купаюцца — дождж будзе.*

*Кот на печку — сцюжка на двор.*

*Жаўранак прылятае на прагаліну, жораў — з цяплом ластаўка — з лістом.*

*Калі ноччу іней — днём снегу не будзе.*

*Восень — на дзень пагод восем.*

*З Вялікадня птушкі пачынаюць пець.*

*Жураўлі ляцяць высока — зіма яшчэ далёка.*

*Жураўлі ляцяць нізка — зіма ўжо блізка.*

**Назіранні за светам жывёл, птушак, раслін**, якія суп раваджаюцца народнымі прыкметамі, даюць магчымасц дзіцяці доследным шляхам вызначыць, ці праўда, што калі:

*Вераб'і ўмацоўваюць свае хованкі — праз некальк дзён пахаладае.*

*Якая зіма — такое і лета.*

*Зіма снежная — лета дажджлівае.*

*Калі ў лютым сталыя марозы — лета гарачае.*

*Які дзень першага лютага — такія і астатнія.*

*Якое Благавешчанне — такі і Вялікдзень будзе.*

Свае назіранні за зменамі ў прыродзе нашы продкі ад люстроўвалі не толькі ў народных прыкметах, але і ў прыказках, казках, загадках. У ***прыказках і прымаў ках*** падкрэсліваліся асаблівасці знешняга выгляду існаван ня і паводзін звяроў і птушак, расказвалася пра карыс насць тых ці іншых раслін і жывёл.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Знаёмства з прыказкамі аб прыродзе дае магчымасць дзіцяці ўсвядоміць багацце і разнастайнасць навакольнага свету, асэнсаваць тыя ўзаемасувязі і ўзаемазалежнасці, якія існуюць у прыродзе і ў жыцці людзей. Прыказкі аб прыродзе можна ўмоўна падзяліць на некалькі тэматычных груп.

Пэўная іх колькасць прысвечана **характарыстыцы пор года і адметным асаблівасцям сезонных з'яў**:

*Вясна красна хоць галадна.*

*Вясною лісток, увосень сучок.*

*Вясну хваляць за дажджы і сонца, а лета — за снапы і вазы.*

*Дзе цвет, там і мёд.*

*Увесну той плача, хто ўвосень скача.*

*Што летам народзіцца, тое зімою спатрэбіцца.*

*Што ўлетку ножкаю коп, тое ўзімку ручкаю хоп.*

*Хоць і шкада кветак, але касі луг як цвіце.*

*Трэба ўлетку назбіраць, каб узімку было што жаваць.*

*Рыхтуй летам сані, а зімой калёсы.*

*Летні дзень год корміць.*

*Лета прагуляўшы, восенню не збярэш.*

*Лета на зіму, а зіма на лета працуюць.*

*Касіць добрага надвор'я не чакаюць.*

*Калі ўлетку дождж рэдка бывае, то ў вуллі мёд прыбывае.*

*Восень кажа: ураджу, а вясна кажа: яшчэ пагляджу.*

*Увосень за сто просім.*

*Восень на рабым кані ездзіць: то снег, то слата.*

*Зімовая ночка — дзеткам сарочка.*

*Зімовы дзянёк што камарыны насок.*

*Усё зімою згодзіцца, што ўлетку ўродзіцца.*

*Прыляцелі снегіры — будзе снежна на двары.*

*З каляд сонца паварочвае на лета.*

*Сонца павярнула на лета, а зіма — на мароз.*

Некаторыя прыказкі расказваюць пра **месяцы кожнай пары года і іх асаблівасці**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Студзень году пачатак, а зіме палавіна.*
*Студзень зямлю студзіць.*
*Прыйдзе люты — спытае, як ты абуты.*
*У лютым востры мароз, кароткая зіма.*
*Люты наробіць плюты.*
*Ад лютага зіма збягае цёмнымі начыма.*
*Віхры і мяцелі ў лютым наляцелі.*
*Завірухі і мяцелі ў лютым адгудзелі.*
*Сакавік часамі снегам сее, а часамі сонцам грэе.*
*Сакавік зялёны, ураджай благі.*
*Няма ў сакавіку вады — няма ў красавіку травы.*
*Сакавік дрэвам сок пускае.*
*Пытае марац, ці цёпла ў палец.*
*У красавіку дождж прыходзіць, сонца грэе.*
*Красавік цяпло нясе.*
*Май зямлю грэе, а сіверам вее.*
*Мокра ў маі, будуць пышныя караваі.*
*Май — і пад кустом рай.*
*Май халодны — год хлебародны.*
*Чэрвень — пачатак лета.*
*Чэрвень не гуляе, ураджай люляе.*
*Ліпень пякучы, але даручы.*
*Ліпень косіць і жне, доўга спаць не дае.*
*Ліпень што спаліць агнямі, тое салье дажджамі.*
*Кожная хата ў жніўні багата.*
*Жнівень жне і косіць — на сталах багацця досыць.*
*Халодны верасень, але сыты.*
*У верасні адна ягадка, ды тая горкая.*
*Як настаў верасень, дык туман кожны дзень.*
*У верасні і ліст на дрэве не трымаецца.*
*Кастрычнік ходзіць па краю і гоніць птушак з гаю.*
*Кастрычнік зямлю балоціць, а лес залоціць.*
*У лістападзе гола ў садзе.*
*Лістапад сцюжаю багат.*
*Лістапад зіме сцежку пракладае.*
*Лістапад снегу навее — хлебу прыбудзе.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Лістапад на рабой кабыле ездзіць: то снег, то слагі.*

*Снежань зіму пачынае, а год канчае.*

*Снежань зямлю грудзіць, хаты студзіць.*

*Снежань сцюжны з зімою дружны.*

*Снежань вока снегам цешыць, ды марозам вуха рве.*

*Сухі снежань — сухая вясна, сухое лета.*

Існуюць у народнай памяці і прыказкі пра **жывёл.** …тваpаючы іх вобразы, нашы продкі знаходзілі вельмі вы…зныя мастацкія сродкі.

*Ваўка ногі кормяць.*

*Ліса і ў сне курэй бачыць.*

*Воўк кожны год ліняе, але нораву не мяняе.*

*Усе птушкі крылы маюць, ды не ўсе лятаюць.*

*Ластаўка дзень пачынае, а салавей канчае.*

*Усякая птушка сваім носам корміцца.*

*І рыба запела б, калі б голас мела.*

*Каму што, а курыцы проса.*

*Кот на печку — сцюжа на двор.*

Створаны прыказкі і прымаўкі пра багацце **расліннага …вету.**

*Грыбок на бок — баравік едзе.*

*Авёс кажа: кінь мяне ў гразь, то я буду князь.*

*Калі вясной запяе ўдод, сей боб.*

*Калі суніца красна, не сей аўса напрасна.*

*Садок садзіць — жыццё харашыць.*

*Шукаць шышак на вярбе.*

*На вярбе грушы не растуць.*

*Колас добра не спее, калі сонца не грэе.*

*Пчала на любую кветку ляціць, але не на кожную ядзе.*

*Лес і вада — родныя брат і сястра.*

*Высокае дрэва здалёку відаць.*

*Дзе мухаморы, там і баравікі.*

*Дзе дубы, там і грыбы.*

*Дзе ягаднік, там і ягады.*

Назіранні за прыродай — гэта крыніца **жыццёвых рад**, якія атрымлівае дзіця ад дарослага з самага ма... ства.

*Якая птушка, такая і песня.*
*Не падкладай агню ў салому.*
*З малой іскры вялікі агонь бывае.*
*У дрэннае надвор'е добры гаспадар і сабаку з дв... не гоніць.*
*Беражы нос у вялікі мароз.*
*Вада камень прабівае.*
*Ціхія воды глыбокія.*
*Не гуляй з агнём.*
*Не зведаўшы броду, не суйся ў воду.*
*Вялікага дуба з малым карэннем не бывае.*
*За вялікім кустом трава зялёная.*
*З малых крыніц вялікая рака нараджаецца.*
*Каля вады стаяць — сухому не быць.*
*Кот да дому прывыкае, а сабака да гаспадара.*
*Кошка мышцы не таварыш.*
*Куды вецер, туды і дождж.*
*Месяц свеціць, ды не грэе.*
*На бітай дарозе трава не расце.*
*Не гані каня кнутом, а гані аўсом.*
*У мароз заснуць лёгка, ды прачнуцца цяжка.*
*Далей у лес — болей дроў.*
*Якая зямля, такі і хлеб.*
*Не ўсякая хмара дажджу дае.*

Паэтызацыя прыроды ў прыказках і прымаўках вызн... чаецца самабытнасцю, мастацкасцю, арыгінальнасцю. Бел... русы не толькі назіралі за зменамі, якія адбываліся ... прыродзе, але і ўвасаблялі гэтыя назіранні ў прыгожы... мастацкія слоўныя формы.

Вельмі цікавяць дашкольнікаў ***загадкі*** пра прыроду, я... стыхіі і з'явы, жывёльны і раслінны свет. У займальна... форме яны змяшчаюць той пазнавальны матэрыял, які у...

гачае дзіця пэўнымі звесткамі аб прыродзе, паглыбляе о экалагічныя ўяўленні. У гэтых малых фальклорных ормах апісанне прыроднага наваколля набывае незвычай-ую вобразнасць і маляўнічасць. Загадкі, як і прыказкі, ожна падзяліць на некалькі тэматычных груп. Дас-пнымі для дзіцячага ўспрымання з'яўляюцца загадкі пра ба, зямлю і ваду, пра раслінны і жывёльны свет, пра ыхіі і з'явы прыроды.

### Неба, зямля і вада

*Сіняя дзяружка ўвесь свет пакрыла.* (Неба.)
*Маленька, залаценька, усё поле асвеціць.* (Сонца.)
*Усе яго любяць, як паглядзяць — моршчацца.* (Сонца.)
*Свечак многа гарыць, а ніводнай не патушыць.* (Зоркі а небе.)
*З высокай дарогі глядзіць бычок крутарогі.* (Месяц.)
*Усіх нас корміць, а сама есці не просіць.* (Зямля.)
*Без ног бяжыць.* (Вада.)

### Стыхіі і з'явы прыроды

*Стукае, грукае, а нідзе яго не відаць.* (Гром.)
*Рук і ног не мае, а дзверы адчыняе.* (Вецер.)
*Ляціць арліца па сіняму небу, крылы распластала, со-ца заслала.* (Хмара.)
*Чакаем і просім усе, а прыйдзе — усе схаваемся.* Дождж.)
*Вечарам нараджаецца, ноч жыве, а раніцай памірае.* Раса.)
*Без рук, без ног, а маляваць умее.* (Мароз.)
*З неба ўпаў, усю зямлю, як абрусам, заслаў.* (Снег.)
*На вадзе родзіцца, а вады баіцца.* (Лед.)
*Ідзе чалавек і сам сябе бачыць.* (Цень.)
*Як гукнецца, так і адзавецца.* (Рэха.)

### Раслінны свет

*Рук многа, а нага адна.* (Дрэва.)
*Што гэта за дрэва зіму і лета зелена?* (Хвоя.)



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Зялёная, а не луг; белая, а не снег; кучаравая, а валасоў.* (Бяроза.)

*Паверх лесу агонь гарыць.* (Рабіна.)

*Паміж гор сядзіць Рыгор, капелюшом накрыц* (Грыб.)

*Не агонь, а пячэцца.* (Крапіва.)

*Броўкі беленькія, а вочкі жоўценькія.* (Рамонак.)

*Ёсць такая трава, што і сляпы знае.* (Крапіва.)

*І мал кірмаш, і вялік кірмаш, а ўсе ў сіненькіх пачках.* (Лен.)

## Свет жывёл

*Пасярод двара стаіць гара, спераду вілы, ззаду мя ла.* (Карова.)

*Двое глядзяць, двое слухаюць, чатыры скачуць, се сот свішчуць.* (Конь.)

*Не згубіла, а ўсё шукае; не хворая, а ўсё крэхч* (Свіння.)

*З барадою, а не стары; з рагамі, а не бык; дояць, не карова; лыкі дзярэ, а лапці не пляце.* (Каза.)

*З людзьмі сябруе, хату вартуе, жыве пад ганка хвост абаранкам.* (Сабака.)

*Маленькія лапкі, на лапках драпкі, ціхенька ступа мышак пужае.* (Кот.)

*Ходзіць цар па гародзе, носіць два бліны ў бародзе, трэці на галаве.* (Певень.)

*Белая як снег, пузатая як мех, на лапатах ходзіц рогам есць.* (Гусь.)

*Улетку шэранькі, узімку беленькі, доўгія вушы ма хутка ў лес уцякае.* (Заяц.)

*Пад соснамі, пад елкамі ляжыць клубок з іголкам* (Вожык.)

*Не рыба, а плавае; не конь, а ходзіць; не пілка, рэжа.* (Бабер.)

*Даўганосы, даўганогі прыляцеў з далёкай дарогі.* (Б сел.)

*Белы бок і чорны бок, па-нямецку кверху скок.* (Сарока.)

*Спераду шыльцы, ззаду вільцы, наверсе чорнае сукно, падыспадам белае палатно.* (Ластаўка.)

Асобна неабходна спыніцца на ***народных паданнях, легендах, вусных сказах***. Яны адлюстроўваюць прыро-
у Беларусі вобразна і маляўніча, падкрэсліваюць наш на-
цыянальны каларыт.

Цікавым будзе для дзяцей знаемства з такімі творамі,
к "Адкуль зязюля ўзялася", "Пра зязюлю", "Чаму воўк
сабакам ды кошка з мышкай варагуюць", "Чаму заяц,
іса ды воўк разам не сыходзяцца", "Адкуль узяўся мя-
зведзь", "Адкуль пайшлі буслы", "Сож і Дняпро", "Па-
оджанне ракі Віліі", "Неман і Лоша", "Пра возера Сві-
язь", "Нарач", "Ад чаго высахла рэчка". Зразумела, што
этым творам уласцівы пэўныя ўмоўнасць, алегорыя. Апі-
анні знешняга выгляду і паводзін жывёл адлюстроўваюць
екаторыя рысы характару чалавека і адносіны, якія ад-
ываюцца паміж людзьмі.

Тое ж тычыцца і ***народных казак пра жывёл***. Ра-
ам з тым гэтыя творы даюць магчымасць педагогу выхо-
ваць у дзяцей здольнасць да суперажыванняў, клапатлі-
ыя адносіны да ўсяго жывога.

Такім чынам, творы вуснай народнай творчасці і сён-
я, на парозе XXI ст., з'яўляюцца для нас найбольш зруч-
ым падручнікам, з дапамогай якога можна вобразна і ма-
яўніча, хутка і лёгка пазнаёміць дзяцей з прыродай ро-
днага краю.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ